УДК 94(075.8)
ББК 63.3я73
Б142

Друкуецца па рашэнні рэдакцыйна-выдавецкага савета БДПУ

Р э ц э н з е н т ы:
кандыдат гістарычных навук, дацэнт кафедры гісторыі паўднёвых і заходніх славян БДУ *Л. А. Козік;*
кандыдат педагагічных навук, дацэнт кафедры гісторыка-культурнай спадчыны РІВШ *С. В. Паноў*

Пад навуковай рэдакцыяй *А. В. Касовіча*

**Багдановіч, І. І.**

Б142 Методыка навучання гісторыі ў школе ў апісаннях, схемах і табліцах : вучэбна-метадычны дапаможнік / І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк ; пад навук. рэд. А. В. Касовіча. – Мінск : БДПУ, 2017. – 204 с.
ISBN 978-985-541-392-0.

Дапаможнік грунтуецца на кароткіх апісаннях, лагічных схемах і тэкставых табліцах, якія паслядоўна раскрываюць асноўныя праблемы зместу курса методыкі выкладання гісторыі ў сучаснай школе. Утрымлівае кампаненты, неабходныя для арганізацыі самастойнай пазнавальнай дзейнасці студэнтаў і фарміравання ў іх прафесійных кампетэнцый настаўніка гісторыі: прыведзены прыкладны план вывучэння кожнай тэмы, грунтоўны спіс навукова-метадычнай літаратуры і блок самакантролю вынікаў засваення, які складаецца з пытанняў і заданняў і тэставых заданняў па асноўных раздзелах курса методыкі выкладання гісторыі.

Адрасуецца студэнтам вышэйшых навучальных устаноў, выкладчыкам ВНУ і каледжаў, настаўнікам і ўсім, хто цікавіцца методыкай навучання гісторыі.

**УДК 94(075.8)**
**ББК 63.3я73**

**ISBN 978-985-541-392-0**

© Багдановіч І. І., Корзюк А. А., 2017
© Афармленне. БДПУ, 2017

Міністэрства адукацыі Рэспублікі Беларусь

*Установа адукацыі*
«Беларускі дзяржаўны педагагічны ўніверсітэт імя Максіма Танка»

***І. І. Багдановіч, А. А. Корзюк***

# МЕТОДЫКА НАВУЧАННЯ ГІСТОРЫІ Ў ШКОЛЕ Ў АПІСАННЯХ, СХЕМАХ І ТАБЛІЦАХ

Рэкамендаваны вучэбна-метадычным аб'яднаннем
па педагагічнай адукацыі ў якасці вучэбна-метадычнага
дапаможніка для студэнтаў устаноў вышэйшай
адукацыі, якія навучаюцца па спецыяльнасцях
1-02 01 01 Гісторыя і грамадазнаўчыя дысцыпліны,
1-02 01 02 Гісторыя і сусветная мастацкая культура,
1-02 01 03 Гісторыя і экскурсійна-краязнаўчая работа

Мінск
БДПУ
2017

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

# *ТЭМА 7.4. МЕТОДЫКА РАСКРЫЦЦЯ ГІСТАРЫЧНЫХ ЗАКАНАМЕРНАСЦЕЙ І РЭАЛІЗАЦЫІ МІЖПРАДМЕТНЫХ СУВЯЗЕЙ*

## План вывучэння тэмы

1. Методыка фарміравання гістарычных заканамернасцей. 2. Сутнасць праблемы міжпрадметных сувязей. 3. Змест міжпрадметных сувязей у навучанні гісторыі. 4. Метадычныя шляхі і прыёмы ўсталявання міжпрадметных сувязей.

## Кароткае апісанне асноўнага зместу тэмы

1. Засваенне сістэмы гістарычных паняццяў падводзіць вучняў да ўсведамлення асноўных заканамернасцей гістарычнага развіцця. Раскрыць *гістарычную заканамернасць* гэта значыць усталяваць аб'ектыўныя, унутраныя, істотныя і паўторныя сувязі паміж гістарычнымі фактамі і з'явамі.

Першая група сувязей – *прычынна-выніковыя*. Іх свядомае засваенне патрабуе стварэння ў вучняў выразных і канкрэтных уяўленняў аб кожным звяне лагічнага ланцужка, які адлюстроўвае змест прычынна-выніковых сувязей, умення абагульніць усе звёны ў адзіны лагічны ланцужок.

Другая група сувязей – *лакальныя*. Усталяванне лакальных сувязей дазваляе выявіць некаторыя істотныя заканамерныя рысы гістарычнага працэсу: абумоўленасць гаспадарчага развіцця і заняткаў людзей прыроднымі ўмовамі, узнікненне першых цывілізацый у далінах вялікіх рэк і г. д.

Трэцяя група сувязей – *часавыя*. Яны дазваляюць усталяваць паслядоўнасць ці адначасовасць падзей і працэсаў у пэўны гістарычны перыяд. Напрыклад, заканамернасць наступлення перыяду феадальнай раздробленасці ці ўтварэння цэнтралізаваных дзяржаў на пэўным этапе развіцця феадальнага грамадства.

У методыцы можна вылучыць тры ўзроўні фарміравання гістарычных заканамернасцей. Пераход да кожнага з іх азначае якасны скачок да новага ўзроўню асэнсавання гісторыі. Першы ўзровень – падвядзенне вучняў да разумення гістарычнага працэсу і яго заканамернасцей без увядзення паняцця «заканамернасць». Гэта работа вядзецца ў 5–6 класах.



На другім узроўні, у 7–9 класах, на аснове групіроўкі фактаў вучні фармулююць абагульняльныя высновы і прыходзяць да заключэння аб іх заканамернасці ў гістарычным развіцці. У 9–11 класах на трэцім узроўні фарміравання гістарычных заканамернасцей вучні самастойна выкарыстоўваюць веды аб іх для тлумачэння гістарычнага працэсу і працэсаў, што адбываюцца ў сучасным грамадскім жыцці.

У аснове фарміравання заканамернасцей ляжыць развіццё гістарычнага мыслення школьнікаў.

2. У тэорыі міжпрадметных сувязей падкрэсліваецца іх універсальнасць і ўсеагульны характар. Таму сутнасць усталявання міжпрадметных і ўнутрыпрадметных сувязей у тым, каб інтэграваць веды і уменні школьнікаў, садзейнічаць фарміраванню сістэмы навуковых ведаў і светапогляду вучняў, навучыць самастойна пераносіць і прымяняць веды, атрыманыя пры вывучэнні адных школьных прадметаў, на вывучэнне іншых.

Спецыфіка зместу гістарычнай адукацыі ў тым, што яна ахоплівае ўсе аспекты жыцця чалавека і грамадства: геаграфічнае асяроддзе, эканоміку, сацыяльныя і нацыянальныя адносіны, палітыку, міжнародныя адносіны, развіццё матэрыяльнай і духоўнай культуры. Таму змест гісторыі як школьнага прадмета ў той ці іншай ступені закранае змест практычна ўсіх прадметаў, вывучаемых у школе, і выконвае інтэгрыруючую светапоглядную функцыю ў сістэме школьнай адукацыі. Менавіта таму іх усталяванне – найважнейшая ўмова рэалізацыі развіццёвага патэнцыялу школьнага курса гісторыі.

2. Міжпрадметныя сувязі ўсталёўваюцца па агульных для розных школьных прадметаў фактах, паняццях, ідэях, уменнях і навыках. Пры гэтым у кожным вучэбным прадмеце неабходна ўлічваць напрамак зместу сувязей па супадаючым фактычным або тэарэтычным матэрыяле, па этапе фарміравання вучэбнага ўмення, або па часе, які аддзяляе яго вывучэнне ў прадметах, з якімі ўсталёўваецца сувязь.

Міжпрадметныя сувязі маюць найважнейшае значэнне для курсаў гісторыі і грамадазнаўства, бо гэтыя прадметы не толькі цесна звязаны паміж сабой агульнасцю факталагічнага і тэарэтычнага зместу, але і з многімі іншымі школьнымі прадметамі: літаратурай,

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ